# Прамова Кісялёва

Глава беларускай дэлегацыі Кісялёў, напомніўшы аб вялікіх мэтах і задачах, сфармуліраваных у статуце арганізацыі Аб'яднаных нацый, з усёй праматой паставіў пытанне аб тым, што ў апошні час пэўнымі рэакцыйнымі антынароднымі коламі ўзнята шуміха аб нібы насоўваючайся новай сусветнай вайне, ствараючая няўпэўненасць і страх сярод народаў. «Каму патрэбна гэтая шуміха аб новай вайне?—пытае Кісялёў.—Яна патрэбна тым, хто за час мінулай сусветнай вайны нажыў велізарныя капіталы. Яна патрэбна буйным трэстам і пушачным каралям, якія атрымалі велізарныя прыбыткі ад ваенных паставак».

Далей прадстаўнік Беларусі прыводзіць ацэнку гэтай шуміхе аб новай вайне, даную Генералісімусам Сталіным у адказе на пытанне карэспандэнта англійскай газеты «Сандэй таймс»: «Я не веру ў рэальную небяспеку «новай вайны». Аб «новай вайне» шумяць цяпер, галоўным чынам, ваенна-палітычныя разведчыкі і абмежаванне прынцыпа аднагалосся пры прыняцці рашэнняў у Совеце Бяспекі, дэлегат Беларусі ўказвае, што сам факт спробы зрабіць рэвізію Статута арганізацыі Аб'яднаных нацый сведчыць аб наяўнасці пагрозы ператварыць гэту арганізацыю з інструмента стварэння ўсеагульнага трывалага міру ў інструмент правядзення сваёй палітыкі асобнымі краінамі або групай краін.

Напомніўшы, што прадстаўнікі Перу, Венесуэлы, Аргентыны, Турцыі, Бельгіі і некаторых іншых краін выступілі на Асамблеі супроць аднагалосся вялікіх дзяржаў, Кісялёў падкрэсліў, што нападкі на прынцып аднагалосся вялікіх дзяржаў маюць на мэце разбіць адзінства Аб'яднаных нацый, бо іменна гэты прынцып служыць асновай арганізацыі Аб'яднаных нацый. «Усякі іншы парадак прыняцця рашэнняў Советам Бяспекі па важнейшых пытаннях арганізацыі міжнароднага міру тоіць у сабе небяспеку ператварыць гэты орган у зброю навязвання аднымі дзяржа- з Іранам і на турэцка-іракскай граніцы, у Палестыне, Трансіярданіі. У Інданезіі англійскія войскі вядуць аднабаковыя ваенныя дзеянні супроць інданезійскага народа, які жадае забяспечыць сваю нацыянальную незалежнасць.

Беларускі дэлегат указаў, што ў сусветнай дэмакратычнай думкі выклікае трывогу прабыванне войск ЗША ў Кітаі. Ваенная дапамога, якая ўзмацняецца з боку ЗША ў карысць адной групіроўкі Кітая супроць кітайскіх дэмакратычных сіл, садзейнічае развязванню грамадзянскай вайны ў краіне. Палітыка ЗША ў Кітаі ні ў якім разе не садзейнічае захаванню міру на Далёкім Усходзе.

Кісялёў напомніў, што англа-амерыканскія ўзброеныя сілы карыстаюцца на тэрыторыі некаторых членаў Аб'яднаных нацый такой шырокай уладай і такімі правамі, на якія можа прэтэндаваць толькі пераможца ў адносінах да пераможанай краіны, хоць, згодна свайго статута, арганізацыя Аб'яднаных нацый аснавана на

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы